сийского государства. В 1839 г. состоялся Полоцкий церковный собор, который утвердил воссоединение литовско-белорусских униатов с православной церковью. Это была политика возвращения белорусам богатейшего наследия их же собственной, создававшейся веками культуры. В период вхождения Белой Руси в состав Российской империи впервые в истории белорусов как особой общности сложились предпосылки не для реставрации Великого княжества Литовского, а для создания собственной национальной белорусской государственности. Предпосылками для этого явились результаты социально-экономических и политических процессов, происходивших на протяжении XIX – начала XX в. внутри России.

Огромную роль в формировании и развитии идеи самоорганизации белорусской этнической общности в нацию-государство сыграли классики белорусской литературы и ряд других выдающихся представителей национальной культуры. Основы национального самосознания белорусского народа эксплицированы в трудах В. Дунина-Марцинкевича, Ф. Богушевича, А. Пашкевич, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Богдановича, А. Луцевича, В. Ластовского, Я. Лесика и др. В период Российской империи важнейшими общественными проблемами выступали вопросы ликвидации крепостного права и охраняющего его царского самодержавия, переустройства жизни на демократических основаниях. Катализатором же их решения явились революционные события начала XX в.

### СПИСОК ЦИТИРОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. Карскі, Я. Беларусы / Я. Карскі. – Мінск: Беларусь, 2001. – 217 с.
2. Котляр, И.И. Права человека / И.И. Котляр. – Минск: Тесей, 2008.
3. Левшун, Л.В. О слове преображенном и слове преображающем: теоретико-аналитический очерк истории восточнославянского книжного слова XI–XVII веков / Л.В. Левшун. – Минск: БПЦ, 2009. – 896 с.
4. Мельник, В.А. Основы идеологии белорусского государства / В.А. Мельник. – 3-е изд., испр. – Минск: Выш. шк., 2013. – 343 с.
5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.starbel.narod.ru. – Дата доступа: 16.04.2015.
6. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. сав. энцыкл.; рэд.: І.П. Шамякін [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.
7. Рыбаков, Б.А. Рождение Руси / Б.А. Рыбаков. – М: Наука, 2003. – 528 с.


*Материал поступил в редакцию 06.10.15*

***LAHUNOUSKAYA A.A. To the question of formation of the Belarusian ethnic community***

In the article the preconditions development of Belarusian ethnic community. The author explores the question of formation of the Belarusian ethnic community in the context of religious and traditional values of the Belarusian people.

УДК 82.09

***Паталкоў Ю.В.***

# ТРЫАДЗІНЫ ПАДЫХОД ДА ЎСПРЫЙНЯЦЦЯ МАСТАЦКАГА ТЭКСТА

Матэрыялаў пра тое, як выкладаць літаратуру ў школе альбо ў ВНУ, напісана незлічона. Між тым відавочна наступнае: у згаданым выкладанні адвечна вядзецца своеасаблівая «халодная вайна».

Першы бок прадстаўляюць педагогі, для якіх у спасціжэнні мастацкага вобраза лагічнае зразуменне прэваліруе над стыхійным пачуццём: літаратура ж,маўляў, павінна адлюстроўваць *эпоху*, даваць грамадству пераканальныя рэцэпты, *абавязковыя для ўсіх*. Пісьменнік – прарок, настаўнік, ментар, духоўны правадыр мільёнаў.Чытач – вучань і наслядоўнік пісьменніка.

Другія сцвярджаюць, што прыгожае можна толькі *адчуць.* На іх думку, рабіць пра мастацкі твор універсальныя высновы нельга, паколькі пачуццё множнага ліку не ведае: ікона прамаўляе да мяне – пра мяне і па-мойму. Пісьменнік пры такім раскладзе рэчаў – творчая асоба , якая не ставіць перад сабою абагульняючых задач. Ён толькі выразна увасабляе *свой уласны* боль з нагоды недасканаласці натуры чалавека. Чытач – асоба, сперажывальна роўная з пісьменнікам. Як і літаратара, чытача пы жыццю вядзе боль душы, мітрэнгі сумлення. Яму не цікавыя асобныя эпохі: яго эпоха – адвечнасць.

Для першых бытаванне мастацкага вобраза *двуадзінае:* пісьменнік – творца кнігі, чытач – яе спажывец. Такую пазіцыю прыняць за канструкктыўную, паколькі незалежна ад нашай волі быццё літаратуры (як і ўсяго на свеце) *трыадзінае*, гэта значыць, пачынаецца не з чалавека, а з Бога.

*Усявышні* – носьбіт душэўнага болю з нагоды недасканаласці прыроды чалавека і грамадства, і выток найгалоўнейшага закліку: «палюбі бліжняга свайго як самога сябе». Менавіта удзелам звышнатуральнага пачатку ў вобразатворчасці тлумачыцца тое, што ў кожным творы апрача зместу рацыянальнага (увасобленнага чалавекам) існуе змест Божы, ірацыянальны, анталагічны, метафізічны, непадуладны нават самому пісьменніку і загадковы для яго.

*Пісьменнік* – «перакладчык» з Гасподняй мовы на чалавечую (выраз І. Гегеля). У яго творы нясцерпны боль і ідэальная любоў Усявышняга увасабляюцца ў сюжэтах, метафарах, персанажах і г.д.

*Чытачу* дастаецца ўспрыймаць вынікі працы двух папярэдніх крэатараў прыгожага і ператвараць гэтыя вынікі ў практыку свайго духоўнага і сацыяльнага побыту, ствараючы тым самым тую новую рэальнасць, якая дае падставу для новых пошукаў і перажыванняў Бога і пісьменнніка.

Тры названыя актанты вобразатворчасці знаходзяцца паміж сабою ў эмпатычных (суперажывальных) узаемінах. Суперажыванне – не спачуванне, не міламжальнасць, а агульная тоеснасць пачуццяў перад аднолькавымі абставінамі. Напрыклад, розныя людзі, якія папалі пад адзін і той жа дождж, суперажвальныя (эмпатычныя). Трыадзіна суперажывальныя паміж сабою Бог, пісьменнік і чытач: перад імі стаіць адна і тая ж абставіна: мажлівая пагібель чалавецтва на планеце Зямля.

З трыадзінай эмпатыяй (суперажывальнасцю) спрачацца нельга: гэтая мегаідэя – не навацыя, не гіпотэза, не адкрыццё, а спаконвечны закон быцця ўсяго існуючага на Зямлі і Сусвеце.

Прыняўшы мегаідэю трыадзінай эмпатыі за аснову спасціжэння мастацкага вобраза, настаўнік павінен будзе прызнаць, што выкладанне літаратуры і ўспрыйняецце зместу мастацкага тэкста павінны існаваць толькі як форма малітоўнай размовы з Усявышнім. Педагогу стане відавочным: можна вывучыць усе метадычныя тэорыі, быць хадзячай энцыклапедыяй літаратуразнаўчых ведаў і пры гэтам не спраўдзіцца ні як выкладчык, ні як даследчык, ні як прыстойная асоба ўвогуле.

Нажаль, у сённяшяй школе мы бачым задбанне трыадзінай эмпатыі, ўпэўненасць, што пры вывучэнні і даследванні літаратуры першасным аказваецца не «эмоцыо», а «рацыо», не суб'ект, а аб'ект, не мастацкі тэкст, а звесткі пра сацыяльныя ўмовы яго бытавання, у канец канцоў – не Бог, а чалавек. Таму стала традыцыйным непасрэдную сустрэчу з тэкстам папярэджваць паведвамленнем звестак пра гістарычную эпоху, біяграфію літаратара, адпаведныя паняцці тэорыі літаратуры. Толькі пасля гэтых неабходных працэдур пачынаецца знаёмства з тэкстам, якое ўжо заведама збеднена: ме-

***Потолков Юрий Васильевич,** доцент кафедры белорусского и русского языков Брестского государственного технического университета. Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

тафізічны змест вобраза ігнаруецца; настаўнік і вучні мімавольна адмаўляюцца ад Вышэйшага маральнага ідэалу (ад першага актанта трыадзінай эмпатыі).

Літаратуразнаўчыя даследванні, звернутыя да школы, таксама будуюцца па хібнай двуадзінай схеме. Звернемся да прыкладу: у 2004 годзе Выдавецкім Саветам Рускай Праваслаўнай Царквы была надрукавана кніга дыякана Андрэя Кураева *«Мастер и Маргарита»:за Христа или против?».* Мы з вялікім піетэтам стасуемся да шляхетнай дзейнасці паважанага дыякана. Але з пытаннем, выкладзеным у назве кнігі, пагадзіцца нельга, паколькі яно двуадзінае, гэта значыць – бязбожнае. Палеміка ў даным выпадку непазбежная: па кніжцы Кураева выкладае раман М. Булгакава шмат хто ў школе і ў ВНУ.

Першая загана згаданай назвы, на наш погляд, у тым, што знакаміты раман патрактаваны ў ёй як з'ява выключна публіцыстычная. Але ж вядома, што грамадска-палітычная састаўляючая прадстаўляе сабою толькі частку (зусім не вырашальную) мастацкага вобразнага зместа. Знешняе падабенства сцэн з удзелам Понтыя Пілата І Га-Ноцры да евангельскага сюжэту не можа прывесці да адказу на пытанне, заяўленае ў назве кнігі Кураева. Сцэны гэтыя архетапічныя, гэта значыць, прадстаўляюць сабою векавечную калізію «улада і паэт». Размова гэтых двух персанажаў па сваёй маральнай сутнасці блізная да дыялогу Пана Патоцкага з Гусляром (Янка Купала «Курган»), фашыскага жандарма з камсамольцам з верша А.Куляшова «Камсамольскі білет», Воўка з Ягняцем у байцы І А.Крылова, медычнай камісіі з Ёэзфам Швейкам у рамане Яраслава Гашэка і г.д.

Калі падыйсці да падобнай сюжэтнай сітуацыі з трыадзінай пазіцыі, дык можна ўбачыць, што ў творы М. Булгакава праз канкрэтныя сюжэтныя абставіны выказаны уласны боль пісьменніка не толькі ад сацыяльнай дысгармоніі , але перш за ўсё ад дысгармоніі у душы кожнага чалавека. Пілат і Га-Ноцры – выступаюць як дзве *асобныя* істоты толькі у сюжэце рамана. У «сюжэце» метафізічным, Божым, гэта значыць, ва ўнутраным сусвеце чытача яны – алегарычныя увасабленні розных духоўных стыхій, субстанцый *адной і той жа* асобы.

З гэтага вынікае адна з асаблівасцей трыадзінага падыходу да мастацкага тэксту, сутнасць якога - у прызнанні , што мастацкая кніга распавядае пра самога мяне – чытача. Разумець сюжэт як апісанне чыёгасці іншага жыцця немаральна. «Падглядваць», да прыкладу, за Куторгам з «Пінскай шляхты» Дуніна-Марцінкевіча бесперспектыўна: Куторга – адно з вобразных увасабленняў маёй, чытача, асобы. Нездарма Гараднічы з гогалеўскага «Рэвізора» прамаўляе несмяротнае: «Над кем смеётесь? Над собой смеётесь!».

Выказванне Гараднічага – можа быць, галоўная вобразная формула падставовага мэтадычнага прыцыпа: на ўроку літаратуры трэба спавядальна «смяяца над сабою». Гэта значыць – праз пасрэдніцтва геніяльнай камедыі стварацьу класе ці ў аудыторыі настрой храма, царквы, малітвы. Лёгка, проста і бяспечна разводзіць пра тое, што «у сваім творы драматург прадставіў ганебныя норавы тагачаснага грамадства і г.д.». Над кім смеяцеся? Урок, лекцыя – гэта ж апошні (і адначасова пачатковы) этап трыадзінага суперажывання! “Не судзіце ды не судзімы будзеце”.

Калі так, дык пытанне Кураева не вытрымлівае крытыкі і ў этычным сэнсе. ”Майстар і Маргарыта” са ўсімі сваімі персанажамі і перыпетыямі – гэта я сам - шматгранны і да нечаканасці непрадказальны. Таму, чытаючы раман пра Воланда, трэба пытацца толькі ў самога сябе: “За Хрыста я ці супраць?”.Такое пытанне, на наш погляд, насамрэч годнае асэнсавання.

Эмпатыя ставіць свае пытанні і да вывучэння асобы пісьменніка. Ніхто не спрачаецца з тым, што гэтую асобу трэба вывучаць. Але як? У імя чаго? Дамовіліся ж, што першааўтарам твора з’яляецца не чалавек, хаця ж бы і найталенавіцейшы. Працуюць маякаведы, горкаведы, быкаведы… Штосьці штучнае і двухсэнсоўнае гучыць у гэтых словах…Шанцуе класіку , да вывучэння асобы якога пыдыход трыадзіны. А калі не? Колькі бруду пра вядомых творцаў літаратуры прыносіць сёння нам сучасная “жоўтая” прэса! Ды ці толькі яна?

Не аднойчы на уроку *творчую індывідуальнасць мастака* настаўнік блытае з інтымнымі *фактамі жыцця чалавека*, які працаваў над творам. Калі першая выцякае з мастацкага тэксту і спавядальна існуе сярод чытачоў, дык дакранацца да другіх – забаронена ў прынцыпе: пісьменнік (жывы ці пайшоўшы з жыцця) мае права на канфедэнцыяльнасць асабістага жыцця. Над кім смяемся? Зараз усё часцей *літарату**ра**знаўства* замяняецца *літаратара*знаўствам.

Чаму вывучэнне творчасці таго ці іншага пісьменніка мы пачынаем найчасцей не з мастацкага тэкста? Чаму дайшоўшы да тэкста, як галоўную вылучаем публіцыстычную састаўляючую яго? Можа, таму, што заглыбленне у праўду Усявышняга ў тэксце патрабуе прылюднай асабістай і ўзаемнай споведзі? Таму сапраўднае вывучэнне літаратуры падмяняем уяўнасцю, праформай, фікцыяй. Значыць, рыхтуем у школе “эрудытаў”, якія ведаюць пра пісьменніка і яго эпоху амаль усё, але не прачыталі ані воднага радка мастацкага тэкста.

А, можа, да гэтакіх штукароў належу я сам? А ён? А яна? Дык дзеля чаго ж уздымаць устрываджаны голас: “Чаму мы перасталі чытаць кнігі?”? Пытанне”твор за ці супраць Хрыста?” - згодна з трыадзіным суперажываннем – з’ява немажлівая:мастацтва сваім аб’ядноўваючаым служэннем ўзаўсёды “за” давер, за “”палюбі блізкага свайго”. Раман М. Булгакава – таксама. Пытанне , якое гучыць у назве кнігі А. Кураева. ставіць нас амаль што не ў інквізіцыйныя суадносіны з “Майстрам і Маргарытай”. Мы сувора пытаемся, а твор павінен бараніцца перад намі.

Возьмем школьную праграму і да кожнага з вывучаемых твораў паставім пытанне:за Хрыста ён ці супраць? Напрыклад, прачытаем пад гэтым контам камедыю Кандрата Крапівы “Хто смяецца апошні?”. Тут жа ёсць свой”Пілат” – Гарлахвацкі. Туляга у канцы твора вырашыўся супроцьстаяць уладарнаму дырэктару інстытута. Ды ці трэба падобнае пытанне ставіць? Можа, патрэбней было б уцяміць, што я, канкрэтны чытач, – і Гарлахвацкі, і Туляга.

*Материал поступил в редакцию 11.10.15*

***POTOLKOV Yu.V. Traditional approach to the perception of literary text***

In the article the principles of empathic study of literature are examined. Based on this approach literary work is perceived as a result of interaction of three creative spiritual beings: the Almighty, the writer and the reader. Among other things the author argues with Deacon Andrei Kuraev about the title of his book "The Master and Margarita": for Christ or against Him.

УДК 356.87

***Лотова И.П.***

# МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ ПСИХОЛОГИЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЙ И ПУТИ ИХ РЕШЕНИЯ

В различных областях психологии методологические трудности проявляются в разной степени. Особенно явно они просматриваются в тех областях психологии, которые занимаются проблемами личности и сознания. Методологические проблемы психологической науки,

***Лотова Ирина Петровна,*** *доктор психологических наук, профессор Институт изучения детства, семьи и воспитания Российской академии образования.*
*Российская Федерация, ФГБНУ Иидсв РАО, г. Москва, ул. Погодинская, 8.*